## Рэкамендацыі па арганізацыі вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская мова» на павышаным узроўні (VIII, IX класы)

На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучэбны прадмет «Беларуская мова» можа вывучацца на павышаным узроўні. Дадатковыя вучэбныя гадзіны (1 або 2 на тыдзень) мэтазгодна выкарыстоўваць на арганізацыю і стымуляванне вучэбнай дзейнасці вучняў па авалоданні ведамі, уменнямі і навыкамі, набыцці вопыту дзейнасці, на развіццё якасцей асобы, творчых здольнасцей і фарміраванне на гэтай аснове прадметных, метапрадметных і асобасных кампетэнцый.

*Табліца 1*

***VIII клас***

| Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (базавы ўзровень) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 1 гадзіна**) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 2 гадзіны**) | Рэкамендацыі па выкарыстанні дадатковых вучэбных гадзін |
|---|---|---|---|---|
| Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры | 1 | 2 | 2 | Аналіз афарыстычных выказванняў пра родную мову, яе ролю ў жыцці грамадства, развіцці нацыянальнай культуры. Складанне слоўнічка адметных слоў беларускай мовы (нацыянальна маркіраваныя словы: назвы рэалій беларускай культуры, гаваркія, безэквівалентныя словы і інш.). Складанне з гэтымі словамі словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў |
| Тэкст | 1 | 2 | 4 | Паглыбленне паняцця пра тэкст і яго лінгвістычныя асаблівасці на ўзроўнях зместу (тэматычнае адзінства), функцыі (стылістычнае адзінства) і формы; удасканаленне ўменняў вызначаць прыметы тэксту, сродкі і спосабы сувязі сказаў і частак тэксту, уменняў ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў з улікам камунікатыўнай задачы |
| Паўтарэнне вывучанага ў V–VII класах | 2 | 3 | 4 | Выкананне розных відаў моўнага разбору (фанетычнага, марфемнага, словаўтваральнага, марфалагічнага, сітнтаксічнага), тэставых заданняў. Работа са слоўнікамі: вызначэнне значэнняў слоў і фразеалагізмаў, падбор сінонімаў, антонімаў і інш. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Стылі маўлення | 2 | 3 | 4 | Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення і стылеўтваральную ролю самастойных і службовых часцін мовы; замацаванне ўменняў вызначаць стыль тэкстаў, іх моўныя асаблівасці, ролю самастойных і службовых часцін мовы ў стварэнні тэкстаў розных стыляў маўлення, уменняў складаць тэксты пэўнага стылю і жанру |
| Сінтаксіс і пунктуацыя | 1 | 2 | 2 | Знаходжанне ў тэкстах словазлучэнняў і сказаў розных відаў, аналіз іх будовы, тлумачэнне пастаноўкі знакаў прыпынку. Складанне словазлучэнняў і сказаў паводле прапанаваных схем |
| Словазлучэнне | 4 | 6 | 8 | Замацаванне тэарэтычнага матэрыялу; выпрацоўка ўменняў знаходзіць словазлучэнні ў тэксце, выяўляць галоўнае слова, групаваць словазлучэнні паводле будовы і значэння, ствараць і разгортваць словазлучэнні з рознымі відамі сінтаксічнай сувязі, перакладаць сказы (тэксты) з адметнымі беларускімі словазлучэннямі, адрозніваць свабодныя і несвабодныя словазлучэнні, дакладна перадаваць змест прачытанага тэксту з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў, выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў |
| Просты сказ | 23 | 35 | 46 | Замацаванне ведаў вучняў пра парадыгму простых сказаў, іх будову, значэнне і ўжыванне; удасканаленне ўменняў выяўляць простыя (двухсастаўныя, аднасастаўныя, няпоўныя) сказы ў тэксце, аналізаваць іх будову, ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні з выкарыстаннем простых сказаў розных відаў у адпаведнасці з пэўнай камунікатыўнай мэтай; удасканаленне навыкаў сінтаксічнага разбору простага сказа |
| Ускладнены сказ | 32 | 46 | 62 | Замацаванне паняцця пра ўскладнены сказ (будова, значэнне, ужыванне); удасканаленне ўменняў выяўляць ускладненыя сказы (з аднароднымі і адасобленымі членамі, звароткамі, пабочнымі словамі і ўстаўнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі) у тэксце, аналізаваць іх будову, ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні з выкарыстаннем ускладненых сказаў розных відаў у адпаведнасці з пэўнай камунікатыўнай мэтай; удасканаленне навыкаў сінтаксічнага разбору ўскладненага сказа |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год | 2 | 2 | 4 | Падагульненне і сістэматызацыя ведаў; удасканаленне ўменняў і навыкаў вучняў па вывучаных раздзелах і тэмах. Сінтаксічны разбор словазлучэнняў і сказаў |
| Рэзервовыя гадзіны | 2 | 4 | 4 | Рэзерв вучэбнага часу настаўнік можа выкарыстаць па сваім меркаванні на развіццё маўлення вучняў |
| **Усяго:** | **70** | **105** | **140** | |

*Табліца 2*

***IX клас***

| Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (базавы ўзровень) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 1 гадзіна**) | Колькасць гадзін на вывучэнне раздзела (павышаны ўзровень, **+ 2 гадзіны**) | Рэкамендацыі па выкарыстанні дадатковых вучэбных гадзін |
|---|---|---|---|---|
| Беларуская мова ў сям'і славянскіх моў і моў народаў свету | 1 | 2 | 2 | Замацаванне ўменняў выяўляць спецыфічныя рысы беларускай мовы, якія адрозніваюць яе ад іншых славянскіх моў, ствараць вусныя выказванні пра славянскія мовы, уласныя тэксты-разважанні пра месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў і моў народаў свету |
| Тэкст | 2 | 4 | 5 | Замацаванне ўменняў вызначаць прыметы тэксту, спосабы і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту, падбіраць сінтаксічныя сінонімы да розных сінтаксіных адзінак, ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з выкарыстаннем сказаў рознай будовы і прызначэння |
| Паўтарэнне | 3 | 6 | 5 | Замацаванне ўменняў ставіць знакі прыпынку ў сказах ускладненай будовы, вызначаць тып тэкстаў, выяўляць у іх апорныя словы і словазлучэнні, сродкі сувязі сказаў і лагічных частак, ствараць выказванні з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў; удасканаленне навыкаў сінтаксічнага разбору простых сказаў |
| Стылі маўлення | 1 | 2 | 3 | Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення і стылеўтваральную ролю самастойных і службовых часцін мовы; замацаванне ўменняў вызначаць стыль тэкстаў, іх моўныя асаблівасці, ролю самастойных і службовых |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | часцін мовы ў стварэнні тэкстаў розных стыляў маўлення, складаць тэксты пэўнага стылю і жанру |
| Складаны сказ | 4 | 6 | 8 | Замацаванне ведаў вучняў пра складаны сказ; удасканаленне ўменняў ставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаных сказаў, складаць самастойныя складаныя сказы розных тыпаў, уключаць іх у самастойныя выказванні тыпу разважання, рабіць падрабязны пераказ тэкстаў |
| Складаназлучаныя сказы | 7 | 10 | 14 | Замацаванне ведаў вучняў пра складаназлучаныя сказы; удасканаленне ўменняў выяўляць складаназлучаныя сказы ў тэкстах, правільна інтанаваць, складаць самастойныя складаназлучаныя сказы, выкарыстоўваць іх у вусных і пісьмовых выказваннях, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку, перабудоўваць простыя сказы з аднароднымі выказнікамі ў складаназлучаныя, складаназлучаныя – у простыя; удасканаленне навыкаў сінтаксічнага разбору складаназлучаных сказаў.<br>Удасканаленне ўменняў перакладаць тэксты з рускай мовы на беларускую, рабіць пісьмовыя паведамленні з апісаннем моўных з'яў |
| Складаназалежныя сказы | 14 | 18 | 28 | Замацаванне ведаў вучняў пра складаназалежныя сказы з рознымі відамі даданай часткі; удасканаленне ўменняў складаць самастойныя складаназалежныя сказы, выкарыстоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку, перабудоўваць простыя сказы з адасобленымі членамі ў складаназалежныя; удасканаленне навыкаў сінтаксічнага разбору складаназалежнага сказа.<br>Удасканаленне ўменняў перакладаць з рускай мовы на беларускую тэксты публіцыстычнага стылю |
| Бяззлучнікавыя складаныя сказы | 12 | 16 | 24 | Замацаванне паняцця пра бяззлучнікавы складаны сказ; удасканаленне ўменняў выяўляць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў тэкстах, вызначаць сінтаксічныя адносіны паміж часткамі, інтанаваць сказы ў адпаведнасці з сэнсам, ставіць знакі прыпынку, ужываць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, выконваць сінанімічныя замены сказаў розных відаў; удасканаленне навыкаў |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | сінтаксічнага разбору бяззлучнікавага складанага сказа.<br>Удасканаленне ўменняў пераказваць тэксты, дакладна перадаючы іх змест, будову і моўнае афармленне |
| Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак | 9 | 14 | 18 | Замацаванне паняцця пра складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак; удасканаленне ўменняў выяўляць у тэкстах складаныя сказы з некалькімі відамі сувязі частак, складаць новыя сказы, карыстацца імі ў вусным і пісьмовым маўленні, ставіць знакі прыпынку, перабудоўваць сказы з рознымі відамі сувязі частак у сказы іншай граматычнай структуры; удасканаленне навыкаў сінтаксічнага разбору сказа з рознымі відамі сувязі частак.<br>Замацаванне ўменняў пісаць афіцыйныя паперы (заяву, аўтабіяграфію і інш.). Замацаванне ўменняў складаць план тэксту, тэзісы, канспект, выступаць перад аўдыторыяй, аналізаваць уласнае і чужое выказванне, перакладаць навукова-папулярныя тэксты з рускай мовы на беларускую |
| Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай | 8 | 13 | 18 | Замацаванне паняцця пра сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай; удасканаленне ўменняў выяўляць у тэкстах канструкцыі з простай і ўскоснай мовай, інтанаваць іх, вызначаць асаблівасці будовы, выкарыстоўваць у маўленні, ставіць знакі прыпынку, карыстацца цытатамі ў адпаведнасці з мэтай і характарам выказвання, замяняць простую мову ўскоснай і наадварот.<br>Удасканаленне ўменняў рыхтаваць тэксты дыскусійных выступленняў з цытаваннем першакрыніц |
| Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год | 4 | 7 | 7 | Падагульненне і сістэматызацыя ведаў; удасканаленне ўменняў і навыкаў вучняў па вывучаных раздзелах і тэмах. Сінтаксічны разбор сказаў рознай будовы |
| Рэзервовыя гадзіны | 3 | 4 | 4 | Рэзерв вучэбнага часу настаўнік можа выкарыстаць па сваім меркаванні на развіццё маўлення вучняў |
| **Усяго:** | **68** | **102** | **136** | |